Nation of Leaders

# СТАТУТ ФОНДУ ГРАМАДЗЯНСКАГА РАЗВІЦЦЯ NATION OF LEADERS

## Раздзел I
## Агульныя палажэнні

### § 1

**Фонд грамадзянскага развіцця Nation of Leaders** (далей — **«Фонд»**) заснаваны спадарыняй Васілісай Дзегцярэнка (далей — **«Заснавальнік»**), якая дзейнічала на падставе натарыяльнага акта, складзенага наменнікам натарыуса спадарыняй Ганнай Завісляк, наменнікам Малгажаты Палган-Пашка — натарыуса ў Варшаве, з офісам у Варшаве, і зарэгістраванага ў Рэпазіторыі А за нумарам 11853/2021.

### § 2

1. Месца знаходжання Фонду — Варшава.
2. Фонд ажыццяўляе сваю дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Польшча і па-за яе межамі.
3. Фонд можа ствараць філіялы і іншыя арганізацыйныя адзінкі як у Рэспубліцы Польшча, так і за яе межамі згодна з адпаведнымі палажэннямі заканадаўства Польшчы або трэціх краін.
4. Фонд можа быць членам арганізацый з падобным профілем дзейнасці.

### § 3

Фонд створаны на неакрэслены тэрмін.

### § 4

1. Фонд ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з законамі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Польшча, у прыватнасці у адпаведнасці з Законам аб фондах ад 6 красавіка 1984 года, і згодна з гэтым Статутам.
2. Фонд з'яўляецца апалітычным і не звязаны ні з якой рэлігійнай канфесіяй.

### § 5

1. Фонд можа выкарыстоўваць свой адметны графічны знак і адпаведнікі сваёй назвы на замежных мовах.
2. Фонд можа выкарыстоўваць пячатку з ідэнтыфікацыйнымі данымі Фонду.
3. Фонд можа ўводзіць нагрудныя знакі і ганаровыя медалі і прысуджаць іх разам з іншымі ўзнагародамі асобам, якія зрабілі асобы ўклад у дзейнасць Фонду.

## Раздзел II
## Статутныя мэты і сфера дзейнасці Фонду

### § 6

1. Фонд ажыццяўляе статутную дзейнасць і  можа весці гаспадарчую дзейнасць.
2. Статутныя мэты Фонду ўключаюць дзейнасць на карысць і ў межах:
   1) рэалізацыі ініцыятыў па падтрымцы развіцця грамадзянскай супольнасці ў незалежнай і дэмакратычнай Беларусі;
   2) рэалізацыі ініцыятыў па падтрымцы развіцця грамадзянскай супольнасці ў незалежнай і дэмакратычнай Рэспубліцы Польшча;
   3) рэалізацыі адукацыйных і даследчых ініцыятыў у галіне дэмакратыі і правоў чалавека ў Беларусі;
   4) умацавання ўзаемных культурных і сацыяльных сувязей паміж Рэспублікай Польшча і Беларуссю;
   5) рэалізацыі адукацыйных і даследчых ініцыятыў у галіне дэмакратыі і правоў чалавека ў Рэспубліцы Польшча;
   6) дзеянняў, накіраваных на эканамічнае і сацыяльнае развіццё ў Беларусі і на тэрыторыі Рэспублікі Польшча;
   7) падтрымкі дзейнасці на карысць дэмакратыі і правоў чалавека ў Беларусі і на тэрыторыі Рэспублікі Польшча;
   8) узмацнення ў грамадстве каштоўнасцей свабоды і справядлівасці як грамадзянскіх прынцыпаў.
3. Фонд можа ажыццяўляць гаспадарчую дзейнасць у аб'ёме, неабходным для рэалізацыі статутных мэт.
4. Прыбытак, атрыманы ў выніку гаспадарчай дзейнасці Фонду, накіроўваецца на рэалізацыю яго

статутных задач.

5. Прадметам гаспадарчай дзейнасці Фонду, згодна з Польскім класіфікатарам відаў дзейнасці (PKD), з'яўляецца дзейнасць у галіне:
   1) дзейнасць інтэрнэт-парталаў (PKD 63.12.Z);
   2) навуковыя даследаванні і распрацоўкі ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук (PKD 72.20.Z);
   3) кнігавыданне (PKD 58.11.Z);
   4) выданне часопісаў і перыёдыкі (PKD 58.14.Z);
   5) дзейнасць, звязаная з вытворчасцю фільмаў, відэазапісаў і тэлепраграм (PKD 59.11.Z);
   6) даследаванне рынку і грамадскай думкі (PKD 73.20.Z);
   7) дзейнасць, звязаная з арганізацыяй кірмашоў, выстаў і кангрэсаў (PKD 82.30.Z);
   8) пазашкольныя формы навучання, не аднесеныя да іншых катэгорый (PKD 85.59.Z);
   9) дзейнасць іншых членскіх арганізацый, не аднесеных да іншых катэгорый (PKD 94.99.Z);
   10) рознічны гандаль па пошце або праз інтэрнэт (PKD 47.91.Z).

### § 7

1. Для рэалізацыі сваіх мэт Фонд:
   1) пастаянна аналізуе стан дэмакратыі ў Беларусі;
   2) арганізоўвае і праводзіць курсы, трэнінгі, сустрэчы клубаў і гурткоў па інтарэсах, канферэнцыі, кангрэсы і круглыя сталы, а таксама навучанне на анлайн-платформах;
   3) ажыццяўляе дзейнасць у падтрымку грамадзянскай пазіцыі, развіцця грамадзянскай супольнасці і дэмакратычных каштоўнасцей у Беларусі і на тэрыторыі Рэспублікі Польшча;
   4) рыхтуе даследаванні і аналітычныя матэрыялы ў галіне абароны дэмакратыі і правоў чалавека;
   5) ажыццяўляе навуковыя даследаванні і распрацоўкі ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук;
   6) ажыццяўляе выдавецкую дзейнасць;
   7) вядзе дзейнасць, звязаную з дыстрыбуцыяй кніг, фільмаў, відэазапісаў і тэлепраграм, адукацыйных курсаў;
   8) аказвае матэрыяльную і фінансавую падтрымку фізічным і юрыдычным асобам, якія выступаюць у абарону дэмакратыі, у тым ліку праваабаронцам і іх сем'ям, а таксама грамадскім актывістам і актывістам, якія працуюць на карысць дэмакратыі на тэрыторыі Беларусі і Рэспублікі Польшча.
2. Дзеянні, акрэсленыя ў пункце 1, Фонд ажыццяўляе ў выглядзе платнай або бясплатнай дзейнасці.

## Раздзел III
## Актывы і даходы Фонду

### § 8

1. Маёмасць Фонду прадстаўлена яго статутным капіталам у памеры 5000,00 злотых (словамі: пяць тысяч польскіх злотых 00/100), з якіх 1000,00 злотых (словамі: адна тысяча злотых 00/100) прызначана для гаспадарчай дзейнасці Фонду, а таксама фінансавымі сродкамі, нерухомай і рухомай маёмасцю і маёмаснымі правамі, набытымі Фондам у працэсе яго дзейнасці.
2. Даходы Фонду паступаюць, у прыватнасці, з:
   1) ахвяраванняў, спадчыны і завяшчальных распараджэнняў;
   2) датацый, субсідый і грантаў;
   3) фондаў Еўрапейскага Саюза;
   4) даходаў ад нерухомай і рухомай маёмасці і маёмасных правоў;
   5) сродкаў, атрыманых ад урада і органаў мясцовага самакіравання;
   6) гаспадарчай дзейнасці.
3. Даходы, атрыманыя ад субсідый, ахвяраванняў, спадчыны і завяшчальных распараджэнняў, могуць быць выкарыстаны для дасягнення любой са статутных мэт Фонду, калі дарыльшчыкі не вызначылі іншага.
4. Фонд можа ажыццяўляць гаспадарчую дзейнасць у аб'ёме, неабходным для рэалізацыі статутных мэт, у адпаведнасці з прынцыпамі, акрэсленымі ў асобных нарматыўных дакументах. Гаспадарчая дзейнасць можа быць толькі спадарожнай, дадатковай дзейнасцю, накіраванай на атрыманне фінансавых сродкаў для ажыццяўлення і развіцця статутнай дзейнасці Фонду. Даход ад гаспадарчай дзейнасці поўнасцю прызначаецца на дасягненне статутных мэт.
5. З маёмасці і даходаў Фонду Праўленне па меры неабходнасці выдзяляе на вядзенне гаспадарчай дзейнасці сродкі ў памеры, не большым за палову статутнага капіталу, банкаўскіх працэнтаў па

статутным капітале і даходаў ад гаспадарчай дзейнасці.

**§ 9**

У выпадку прызначэння Фонду спадчыны, Праўленне падае заяву аб прыняцці спадчыны з вопісам толькі ў тым выпадку, калі падчас падачы гэтай заявы відавочна, што фактычны стан спадчыны значна перавышае абавязацельствы, якія наследуюцца.

**§ 10**

1. Фізічныя, юрыдычныя асобы ці іншыя арганізацыйныя адзінкі, якія робяць аднаразовае ці агульнае ахвяраванне або датацыю Фонду на суму, роўную не менш за 50 000,00 злотых або, у выпадку замежных асоб, 10 000 (дзесяць тысяч) долараў ЗША/еўра, па іх жаданні могуць атрымаць званне Спонсара Фонду.
2. Званне спонсара прызначаецца персанальна.
3. Фізічныя, юрыдычныя асобы ці іншыя арганізацыйныя адзінкі, якія робяць асобы ўклад у дзейнасць Фонду ці папулярызуюць яго дзейнасць, па іх жаданні могуць атрымаць званне Амбасадора Фонду.

## Раздзел IV
## Органы кіравання Фондам

**§ 11**

Органамі кіравання Фондам з'яўляюцца
1) Праўленне Фонду;
2) Рада Фонду.

### Праўленне Фонду

**§ 12**

1. У склад Праўлення Фонду ўваходзіць ад 2 (дзвюх) да 5 (пяці) асоб, у тым ліку Старшыня Праўлення, якія выбіраюцца на трохгадовы тэрмін. Сябра Праўлення можа займаць пасаду больш за адзін тэрмін.
2. Праўленне Фонду выбіраецца Радай Фонду.
3. Сяброўства ў Праўленні спыняецца ў выніку:
   1) пісьмовай заявы аб выхадзе са складу Праўлення, пададзенай у Раду Фонду;
   2) уступлення ў законную сілу прысуду за наўмыснае злачынства;
   3) смерці ці страты дзеяздольнасці;
   4) адхілення ад пасады Радай Фонду.
4. Праўленне ў цэлым або любы з яго сябраў можа быць адхілены ад пасады Радай Фонду да заканчэння тэрміну паўнамоцтваў.
5. Праўленне кіруе дзейнасцю Фонду і выступае ад яго імя.

**§ 13**

1. У паўнамоцтвы Праўлення Фонду ўваходзіць:
   1) прадстаўленне Фонду перад трэцімі асобамі;
   2) клопат пра маёмасць Фонду;
   3) кіраванне бягучай дзейнасцю Фонду;
   4) зацвярджэнне палажэнняў і ўнутраных дакументаў Фонду;
   5) прыём ахвяраванняў, спадчыны і завяшчанняў;
   6) распрацоўка планаў дзейнасці Фонду;
   7) прыняцце рашэнняў аб прыёме на працу, прынцыпах аплаты працы, памеры сродкаў на аплату працы і прэміравання супрацоўнікаў Фонду;
   8) стварэнне і ліквідацыя арганізацыйных адзінак Фонду;
   9) унясенне прапаноў аб унясенні змен у Статут Фонду, аб змяненні мэт Фонду, аб зліцці або ліквідацыі Фонду, аб размеркаванні яго маёмасці;
   10) падрыхтоўка справаздач аб дзейнасці Фонду;
   11) увядзенне і ўзнагароджанне нагруднымі знакамі, медалямі і ганаровымі званнямі, прэміямі і іншымі знакамі адрознення асоб, якія маюць заслугі перад Фондам або рэалізуюць яго статутныя мэты.
2. Праўленне абавязана штогод прадстаўляць Радзе гадавую справаздачу аб дзейнасці Фонду.

**§ 14**

1. Пасяджэнне Праўлення Фонду можа быць склікана па ініцыятыве любога сябра Праўлення. Пасяджэнне вядзе Старшыня, а ў выпадку яго адсутнасці — іншы сябра Праўлення, выбраны прысутнымі.
2. Асоба, якая склікае пасяджэнне, павінна праінфармаваць усіх сябраў Праўлення Фонду пра месца і дату правядзення пасяджэння па электроннай пошце, па пошце ці па тэлефоне не менш як за 3 дні да запланаванага пасяджэння.
3. Праўленне прымае рашэнні ў форме пастаноў простай большасцю галасоў у прысутнасці не менш як паловы ад агульнай колькасці яго сябраў, у тым ліку Старшыні Праўлення Фонду, калі палажэнні Статута не прадугледжваюць іншага. У выпадку роўнай колькасці галасоў вырашальным лічыцца голас Старшыні Праўлення.
4. Праўленне праводзіць пасяджэнні не радзей за адзін раз на год.
5. Сябры Праўлення і Старшыня Праўлення могуць мець працоўныя адносіны з Фондам.

**Рада Фонду**

**§ 15**

1. У Раду Фонду ўваходзіць ад 3 (трох) да 5 (пяці) сябраў.
2. Рада Фонду абіраецца на трохгадовы тэрмін. З ліку сваіх сябраў Рада выбірае Старшыню, які будзе кіраваць яе працай, і Намесніка Старшыні.
3. Сябраў першага складу Рады прызначае Заснавальнік. У далейшым сябры Рады прызначаюцца Радай па яе рашэнні для замены асоб, якія выбылі са складу Рады, або для пашырэння складу Рады, пры гэтым Заснавальнік мае права прызначаць і вызваляць ад пасады двух сябраў Рады. Заснавальнік можа прызначыць фізічную ці юрыдычную асобу, якая возьме на сябе ажыццяўленне вышэйзгаданага паўнамоцтва, з правам далейшай перадачы гэтага паўнамоцтва, пры ўмове афармлення ў пісьмовай форме з натарыяльна завераным подпісам.
4. У асобых выпадках сябра Рады можа быць вызвалены ад выканання абавязкаў і пазбаўлены сяброўства ў Радзе па рашэнні астатніх сябраў Рады.
5. Сяброўства ў Радзе спыняецца ў выніку:
   1) падачы пісьмовай заявы аб выхадзе са складу Рады;
   2) уступлення ў законную сілу прысуду за наўмыснае злачынства;
   3) смерці ці страты дзеяздольнасці;
   4) адхілення ад пасады па ініцыятыве Рады Фонду.
6. Сяброўства ў Радзе Фонду не можа сумяшчацца з сяброўствам у Праўленні.
7. У склад Рады можа ўваходзіць Заснавальнік.

**§ 16**

Рада Фонду з'яўляецца органам, які мае паўнамоцтвы па вылучэнні ініцыятыў і кансультатыўныя паўнамоцтвы, а таксама органам унутранага кантролю і нагляду.

**§ 17**

1. Рада Фонду працуе на пасяджэннях, якія праводзяцца мінімум адзін раз на год, а таксама ажыццяўляе кантрольную дзейнасць у акрэсленых ёй рамках і тэрмінах.
2. Пасяджэнні Рады склікаюцца Старшынёй Рады па ўласнай ініцыятыве або па запыце Праўлення.
3. Пасяджэнне Рады можа быць склікана ў пазачарговым парадку для разгляду справы асобага характару па ініцыятыве Праўлення Фонду ці па пісьмовым запыце Старшыні Рады або мінімум двух яе сябраў.
4. Пасяджэнні Рады ўзначальвае Старшыня ці Намеснік Старшыні.
5. За выкананне функцый у гэтым органе сябры Рады могуць атрымліваць кампенсацыю абгрунтаваных выдаткаў або ўзнагароджанне ў памеры, які не перавышае сярэднямесячнага ўзнагароджання ў прадпрымальніцкай сферы, аб'яўленага Старшынёй Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення за папярэдні год.
6. У пасяджэннях Рады прымае ўдзел прадстаўнік Праўлення Фонду.

### § 18

1. Сябрам Рады Фонду не можа быць асоба, у дачыненні да якой уступіў у законную сілу прысуд за здзяйсненне наўмыснага злачынства, што пераследуецца па публічным абвінавачванні, або за падатковае злачынства.
2. Сябры Рады Фонду не могуць быць сябрамі Праўлення або знаходзіцца з сябрам Праўлення ў шлюбе, сваяцтве ці службовым падначаленні.

### § 19

Рашэнні Рады Фонду прымаюцца простай большасцю галасоў у прысутнасці не менш як паловы яе сябраў, калі Статутам не прадугледжана іншае. У выпадку роўнай колькасці галасоў вырашальным лічыцца голас Старшыні Праўлення, а ў выпадку яго адсутнасці — Намесніка Старшыні.

### § 20

У задачы Рады Фонду ўваходзіць:

1) вызначэнне асноўных кірункаў дзейнасці Фонду;
2) падрыхтоўка заключэння па шматгадовых і гадавых праграмах дзейнасці Фонду;
3) падрыхтоўка заключэння па пытаннях, прапанаваных Праўленнем;
4) нагляд і кантроль за дзейнасцю Фонду, у прыватнасці кантроль за маёмасцю Фонду;
5) разгляд і зацвярджэнне гадавых справаздач Праўлення Фонду аб яго дзейнасці;
6) зацвярджэнне гадавой фінансавай справаздачнасці Фонду;
7) вынясенне Праўленню вотуму даверу;
8) зацвярджэнне ўнутраных дакументаў Фонду, у тым ліку палажэння аб выкарыстанні маёмасці і даходаў Фонду;
9) прыняцце рашэнняў па пытаннях, вызначаных Статутам;
10) прызначэнне і вызваленне ад выканання абавязкаў сябраў Праўлення, у тым ліку Старшыні Праўлення;
11) прыняцце рашэнняў аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Статут Фонду;
12) прыняцце рашэнняў аб зліцці з іншым фондам ці аб ліквідацыі Фонду;
13) прыняцце рашэнняў па ўсіх іншых справах, якія не адносяцца да кампетэнцый іншых органаў кіравання Фондам;
14) выказванне згоды на поўны ці частковы продаж, здачу ў арэнду або залог маёмасці Фонду;
15) выказванне згоды на набыццё ці продаж нерухомай маёмасці, права бестэрміновага выкарыстання ёй, а таксама доляй у нерухомай маёмасці і правам бестэрміновага карыстання ёй.
16) выказванне згоды на ажыццяўленне аперацыі на суму, што перавышае 100 000 еўра (сто тысяч) еўра.

### § 21
### Прыняцце рашэнняў і арганізацыя пасяджэнняў з дапамогай электронных сродкаў камунікацыі

1. Рашэнні органаў кіравання Фондам могуць быць прыняты ў пісьмовай форме шляхам выкарыстання сродкаў дыстанцыйнай сувязі.
2. Пры наяўнасці задакументаванай згоды сябраў органаў кіравання Фондам галасаванне па-за пасяджэннямі органаў кіравання Фондам можа адбывацца з выкарыстаннем электронных сродкаў сувязі.
3. Магчымасць удзелу ў пасяджэнні органаў кіравання Фондам з выкарыстаннем электронных сродкаў сувязі пазначаецца ў абвестцы аб правядзенні такога пасяджэння, якая змяшчае падрабязнае апісанне спосабу ўдзелу і рэалізацыі права голасу.
4. Выкарыстанне электронных сродкаў сувязі для галасавання на пасяджэннях органаў кіравання Фондам павінна забяспечваць як мінімум:
   1) трансляцыя пасяджэння ў рэжыме рэальнага часу;
   2) двухбаковая сувязь у рэжыме рэальнага часу, у рамках якой сябра органаў кіравання Фондам можа выступаць у ходзе пасяджэння;
   3) магчымасць рэалізаваць права голасу асабіста ці па даверанасці да або падчас правядзення сходу.

## Раздзел V
## Спосаб прадстаўлення і прыняцце фінансавых абавязацельстваў

### § 22

Старшыня Праўлення Фонду аднаасобна або два сябры Праўлення, якія дзейнічаюць сумесна, упаўнаважаны да ажыццяўлення ад імя Фонду волевыяўлення, у тым ліку па маёмасных пытаннях.

### § 23

Забараняецца:

1) выдаваць пазыку ці забяспечваць абавязацельствы маёмасцю Фонду ў дачыненні да яго сябраў, сябраў яго органаў або супрацоўнікаў, або асоб, з якімі сябры, сябры органаў і супрацоўнікі знаходзяцца ў шлюбе ці сужыцці, або кроўным сваяцтве ці сваяцтве па прамой лініі, або ў адносінах кроўнага сваяцтва ці сваяцтва па пабочнай лініі да другой ступені, або звязаныя ўсынаўленнем, апекай або папячыцельствам, далей названых «блізкімі асобамі»;
2) перадаваць актывы Фонду на карысць яго сябраў, сябраў органаў або супрацоўнікаў ці іх блізкіх асоб на ўмовах іншых, чым у дачыненні да трэціх асоб, у прыватнасці калі такая перадача ажыццяўляецца бясплатна ці на льготных умовах;
3) выкарыстоўваць актывы на карысць яго сябраў, сябраў органаў ці супрацоўнікаў і іх блізкіх на прынцыпах іншых, чым у дачыненні да трэціх асоб, за выключэннем выпадкаў, калі такое выкарыстанне непасрэдна звязана са статутнай мэтай;
4) набываць тавары ці паслугі ў арганізацый, у якіх удзельнічаюць сябры Фонду, сябры яго органаў ці супрацоўнікі і іх блізкія, на прынцыпах, адрозных ад прынцыпаў у дачыненні да трэціх асоб, або па цэнах, вышэйшых за рынкавыя.

## Раздзел VI
## Унясенне змяненняў у Статут

### § 24

1. Рашэнні аб унясенні змяненняў у Статут прымаюцца Радай Фонду большасцю ў 2/3 галасоў у прысутнасці не менш як паловы яе сябраў, у тым ліку Старшыні або Намесніка Старшыні, пасля атрымання пісьмовай згоды Заснавальніка, засведчанай натарыяльна. Заснавальнік можа прызначыць фізічную ці юрыдычную асобу, якая возьме на сябе ажыццяўленне вышэйзгаданага паўнамоцтва, з правам далейшай перадачы гэтага паўнамоцтва, пры ўмове афармлення ў пісьмовай форме з натарыяльна завераным подпісам.
2. Змяненне Статута можа тычыцца мэт, для рэалізацыі якіх быў заснаваны Фонд, акрэсленых ва ўстаноўчым акце, аднак такое рашэнне павінна быць аднагалосным у прысутнасці ўсіх сябраў Рады Фонду пасля атрымання пісьмовай згоды Заснавальніка, засведчанай натарыяльна. Заснавальнік можа прызначыць фізічную ці юрыдычную асобу, якая возьме на сябе ажыццяўленне вышэйзгаданага паўнамоцтва, з правам далейшай перадачы гэтага паўнамоцтва, пры ўмове афармлення ў пісьмовай форме з натарыяльна завераным подпісам.

## Раздзел VII
## Заключныя палажэнні

### § 25

1. Для эфектыўнага дасягнення сваіх мэт Фонд можа аб'яднацца з іншым фондам.
2. Рашэнне аб зліцці прымаецца Радай Фонду аднагалосна пасля атрымання пісьмовай згоды заснавальніка, засведчанай натарыяльна. Заснавальнік можа прызначыць фізічную ці юрыдычную асобу, якая возьме на сябе ажыццяўленне вышэйзгаданага паўнамоцтва, з правам далейшай перадачы гэтага паўнамоцтва, пры ўмове афармлення ў пісьмовай форме з натарыяльна завераным подпісам.

### § 26

1. Фонд ліквідуецца ў выпадку дасягнення мэт, дзеля якіх быў заснаваны, ці вычарпання яго фінансавых

сродкаў і актываў.

2. Рашэнне аб ліквідацыі прымае Рада Фонду аднагалосна пасля атрымання пісьмовай згоды заснавальніка, засведчанай натарыяльна. Заснавальнік можа прызначыць фізічную ці юрыдычную асобу, якая возьме на сябе ажыццяўленне вышэйзгаданага паўнамоцтва, з правам далейшай перадачы гэтага паўнамоцтва, пры ўмове афармлення ў пісьмовай форме з натарыяльна завераным подпісам.

**§ 27**

Маёмасць, якая засталася пасля ліквідацыі Фонду, перадаецца з улікам палажэнняў арт. 5 п. 4 Закона аб фондах установам, чыя дзейнасць адпавядае статутным мэтам Фонду.

**§ 28**

Фінансавым годам з'яўляецца каляндарны год.